# Напярэдадні ленінскіх дзён

Мінскі гарком партыі зацвердзіў план правядзення ленінскіх дзён. Вылучана група дакладчыкаў для правядзення дакладаў на прадпрыемствах, ва ўстановах і на будоўлях горада. Для дакладчыкаў і агітатараў лектар ЦК КП(б)Б тав. Гурэвіч зрабіў інструктыўны даклад.

На ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах і на выбарчых участках праводзяцца гутаркі на тэмы: «Ленін—арганізатар і правадыр бальшэвіцкай партыі і савецкай дзяржавы», «Ленін і Сталін—натхніцелі і арганізатары сацыялістычнага будаўніцтва СССР», «Перамога ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі» і г. д.

У Доме партыйнай асветы і ў бібліятэках імя Леніна і Пушкіна арганізаваны выстаўкі літаратуры, прысвечаныя жыццю і рэвалюцыйнай дзейнасці Уладзіміра Ільіча Леніна.

З 20-га па 22-га студзеня на ўсіх прадпрыемствах, ва ўстановах, на будоўлях і на выбарчых участках горада будуць праведзены сходы з дакладамі на тэму: «23 гады без Леніна, пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна па ленінскаму шляху».

21 студзеня ў Акруговым Доме афіцэраў адбудзецца ўрачыста-жалобнае пасяджанне Выканкома гарсовета сумесна з прадстаўнікамі партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх і грамадскіх арганізацый горада, прысвечанае памяці Уладзіміра Ільіча Леніна.